Спецвыпуск

# NIKA

Студэнцкая газета гістарычнага факультэта БДУ

Сакавік, 2015



# 70 гадоў Перамогі

# Яны былі першымі...

У гады Вялікай Айчыннай вайны з першых дзён варожай акупацыі жыхары Беларусі высока паднялі сцяг народнай барацьбы супраць захопнікаў. Многія з іх сталі таленавітымі арганізатарамі падпольнага і партызанскага руху, мужнымі і бясстрашнымі камандзірамі партызанскіх атрадаў. Годнае месца ў радах гэтых патрыётаў займаюць кіраўнікі першага партызанскага атрада на Палессі - Ціхан Бумажкоў і Фёдар Паўлоўскі. Ім і прысвячаецца гэты артыкул ...



*Ц. Бумажкоў*

Амаль у цэнтры Беларускага Палесся - паміж Мазыром і Бабруйскам - знаходзіцца паселішча Акцябрскае. Менавіта тут разгараліся першыя ачагі партызанскага руху ў часы Вялікай Айчыннай вайны. 22 чэрвеня 1941 года была склікана нарада раённага актыву. Першы сакратар Кастрычніцкага райкама партыі былой Палескай вобласці Ціхан Бумажкоў усхвалявана паведаміў, што гітлераўская Германія напала на Савецкі Саюз і святы абавязак камуністаў - мабілізаваць усё насельніцтва на барацьбу з ворагам. Удзельнікі нарады прынялі рашэнне аб стварэнні знішчальнага атрада, на чале якога стаў Фёдар Паўлоўскі, а штаб ўзначаліў Ціхан Бумажкоў.

Неўзабаве Бумажкоў і Паўлоўскі ўжо стварылі партызанскі атрад «Чырвоны Кастрычнік». З успамінаў Ц. Бумажкова, апублікаваных у газеце «Праўда» 18 жніўня 1941 года: «…Наш атрад спачатку налічваў усяго 80 чалавек. Сярод іх былі прадстаўнікі партыйнага і камсамольскага актыву, якія і склалі ядро атрада. Разбіўшыся на звёны і аддзяленні, мы распачалі вайсковыя заняткі: навучаліся маскіроўцы, майстэрству валодання зброяй, карыстанню тапаграфічнай картай, компасам. Набылі мы і неабходныя сапёрныя веды…». А скончыў артыкул ён наступнымі словамі: «…ашалелым гітлераўскім бандытам не зламаць нашага баявога духу, і не сыйсці фашыстам ад народнай помсты!…».

Пад камандаваннем Бумажкова атрад «Чырвоны Кастрычнік» здзейсніў шэраг смелых налётаў на ворага: на працягу 9 дзён утрымліваў пераправу праз раку Пціч і ўдзельнічаў у разгроме штаба нямецкай дывізіі. За месяц партызаны падарвалі 4 масты, 10 танкаў. Разам з часткамі Чырвонай Арміі атрад правёў шэраг паспяховых аперацый у тыле нямецка-фашысцкіх войскаў. Гітлераўцы ў сваіх данясеннях паведамлялі аб тым, што ім супрацьстаіць... буйная вайсковая частка, якая апынулася ў акружэнні. Цана за галаву Ціхана Бумажкова з кожным днём узрастала. Мясцовае ж насельніцтва ўбачыла ў яго асобе маладога энергічнага чалавека, не толькі добрага партыйнага кіраўніка раёна ў мірны час, але і мужнага ваяра ў суровыя дні вайны, добрага ваеннага камандзіра і арганізатара. Але ў жніўні 1941 года Бумажкоў быў адкліканы ў Чырвоную Армію і накіраваны на Паўднёва-Заходні фронт. Загад ёсць загад. Відавочна, ён там быў больш патрэбны. З сумам праводзілі партызаны свайго баявога кіраўніка... Неўзабаве яго злучэнне трапіла ў акружэнне, і ў баі ў Палтаўскай вобласці Ціхан Бумажкоў загінуў смерцю адважных…

Падобным да Бумажкова быў і Фёдар Паўлоўскі (да вайны ён працаваў на шахце ў Данбасе, удзельнічаў у баях ля возера Хасан і ў савецка-фінскай вайне). У жніўні 1941 года, калі Бумажкоў быў адкліканы на фронт, камандаванне атрадам цалкам перайшло да Паўлоўскага.

За арганізацыю партызанскага атрада і першыя паспяховыя баі супраць гітлераўскіх войскаў Фёдару Паўлоўскаму і Ціхану Бумажкову Загадам Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР ад 6 жніўня 1941 года была прысвоена годнасць Героя Савецкага Саюза. Яны сталі першымі партызанамі, якія былі вартыя гэтага высокага звання.

Да канца 1941 года партызаны вызвалілі многія населеныя пункты Кастрычніцкага раёна. Так

быў пакладзены пачатак стварэнню адной з першых партызанскіх зон, дзе райкам партыі і ўсе органы Савецкай улады засталіся на месцы. Трэба было неяк наладжваць жыццё ў тыле ворага, клапаціцца пра насельніцтва, рыхтавацца да зімы. Калгаснікі прыбіралі ўраджай. У Рудабелцы працавалі майстэрні па рамонце зброі, швейныя і абутковыя майстэрні, млын, выпускалася газета, працавала школа.

У канцы студзеня 1942 года адбылася нарада камандзіраў атрадаў, на якой вырашылі аб'яднаць гэтыя партызанскія фармаванні пад адзіным кіраўніцтвам. Фёдар Іларыёнавіч узначаліў будучы атрад. Аб'яднанне атрымала назву «Гарнізон Паўлоўскага». У яго склад увайшлі 13 партызанскіх атрадаў. Да восені 1943 года ў Кастрычніцкай партызанскай зоне налічвалася да 18 тысяч партызан. У канцы лістапада 1943 года ў выніку Гомельска-Рэчыцкай аперацыі і дзеянняў партызанскай брыгады пад камандаваннем Паўлоўскага, на лініі фронту групы армій «Цэнтр» утварыўся разрыў шырынёй каля 10 кіламетраў, які ўвайшоў у гісторыю як «Рудабельскія вароты». Часткі Чырвонай Арміі і партызаны ўтрымлівалі іх каля месяца. У канцы 1943 года Фёдар Паўлоўскі быў адкліканы ў Маскву.

У пасляваенныя гады Паўлоўскі жыў у Мінску, знаходзіўся на партыйнай і гаспадарчай рабоце. 6 красавіка 1989 года Фёдара Іларыёнавіча не стала.



*Ф. Паўлоўскі*

Памяць аб слаўных партызанах назаўжды захавалася ў сэрцах беларусаў, у назвах вуліц, школ, у помніках і абелісках, у вершах. У Беларускім дзяржаўным музеі гісторыі Вялікай Айчыннай вайны ў адной з залаў захоўваюцца неверагодна каштоўныя рэліквіі - гімнасцёрка, атэстат аб заканчэнні тэхнікума Ціхана Бумажкова, кавалерыйская шашка і аўтамат Фёдара Паўлоўскага, копія загада Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР аб прысваенні мужным партызанам звання Героя Савецкага Саюза.

***Ілля Чарняўскі***

# Вінтоўка замест канспектаў

Чэрвень 1941 года. БДУ рыхтуецца святочна адзначыць сваё 20-годдзе. Апошнія штрыхі да былі давядзены акурат 21 чэрвеня…

Пачалася вайна. З першых яе дзён выкладчыкі і студэнты пачалі запісвацца ў Чырвоную Армію. Усе яны верылі ў яе моц і чакалі хуткай паразы вермахта. Таму навучанне ў БДУ не спынілася: 23 чэрвеня студэнты трымалі іспыт, а на наступны дзень было запланавана ўручэнне дыпломаў. Аднак у сувязі з бамбардзіроўкамі заняткі было вырашана прыпыніць, але часова. Праз некалькі дзён сталіца БССР была захоплена і ўніверсітэт спыніў сваю дзейнасць.



место печати

(подпись владельца)

НАРКОМПРОС РСФСР

(полное наим. университета или института)

СТУДЕНЧЕСКИЙ БИЛЕТ №

Фамилия Мележ

Имя Иван

Отчество Павлович

Время поступления 1943 г.

Факультет

Директор института

Билет действителен до 194 г.

Дата выдачи билета 194 г.

*Іван Мележ у час вайны быў паранены пад Растовам і не здолеў больш вярнуцца на фронт. Ён становіцца студэнтам БДУ, якія ў той час размяшчаўся на станцыі Сходня. У жніўні 1944 года, пасля вызвалення Беларусі, першая група студэнтаў – 26 чалавек – на чале з рэдактарам прыбыла ў Менск. І. Мележ прымаў актыўны ўдзел у працэсе рэвакуацыі.*



*Георгій Фалевіч( Жорж) – студэнт хімічнага факультэта БДУ, да пачатку вайны паспеў скончыць 4 курс. У час ВАВ у акупіраваным Менску разам з іншымі студэнтамі прымаў удзел у дзейнасці падпольнай камсамольска-маладзёжнай групы, якую ў выніку ўзначаліў у перыяд з верасня 1941г. па май 1942г. У верасні 1942 г. Георгій Фалевіч быў расстраляны. Ён узнагароджаны ордэнам "Айчыннай вайны" II ступені ( пасмяротна).*

Эвакуяваць БДУ не паспелі. У руках немцаў апынулася ўся матэрыяльная база ўніверсітэта. На яго тэрыторыі былі размешчаныя атрады СД, падвалы былі прыстасаваныя пад турму, а ў двары ўсталявалі шыбеніцу. Усё самае каштоўнае: абсталяванне, кнігі, музейныя калекцыі БДУ захопнікі вывезлі ў Германію, а астатняе было знішчана і разрабавана. Выратаваць атрымалася зусім няшмат.

Згодна з загадам акупацыйных уладаў усе ВНУ на захопленых тэрыторыях павінны былі быць зачынены - БДУ не стаў выключэннем. Разам з тым, усе навуковыя супрацоўнікі і выкладчыкі мусілі ўладкавацца на працу. Па спецыяльнасці працаваць маглі толькі медыкі. Астатнія прадстаўнікі навуковай інтэлігенцыі прымусова ішлі працаваць школьнымі настаўнікамі, машыністамі, прыбіральшчыкамі, чорнарабочымі і г.д. Да гэтага іх вымушала пагроза галоднай смерці і магчымая адпраўка ў Германію. Тым не менш, некаторыя навукоўцы свядома ўхіляліся ад працы; напрыклад, акадэмік Нікольскі, які хаця і галадаў, але здолеў жыць за кошт продажу уласных рэчаў.

Большасць выкладчыкаў, супрацоўнікаў, студэнтаў і выпускнікоў БДУ адмовіліся ад супрацоўніцтва з акупантамі і прынялі актыўны ўдзел у супраціўленні. Прыгадаем некаторых герояў, асабліва тых, хто ўласным подзвігам складаў гісторыю нашага факультэта.

Выдатную ролю ў дзейнасці Мінскага падполля адыграла Марыя Малаковіч. Дзякуючы яе намаганням з Мінска разам з сям'ёй быў вывезены прафесар Нікольскі. Таксама маладая жанчына вяла актыўную агітацыйна-прапагандысцкую працу, кіравала зборам для партызан армейскага абмундзіравання, зброі, звестак пра размяшчэнне нямецкіх войскаў. Лёс яе быў трагічны. У канцы 1943 г. Марыя Фёдараўна была схопленая і закатаваная ў гестапа.

Сувязной Мінскага падполля была выкладчыца біяфака Ганна Язубчык. Разам з Марыяй Малаковіч яна перапраўіла шмат людзей з Мінска ў партызанскія атрады. У сталіцы падпольшчыца распаўсюджвала газеты, дзе былі сапраўдныя звесткі пра ход ваенных дзеянняў. Працуючы прыбіральшчыцай у будынку Акадэміі навук, жанчына прыносіла адтуль розныя хімікаты, з дапамогай якіх падпольшчыкі псавалі прадукты, прызначаныя нямецкаму войску. Праз некаторы час яна апынулася ў складзе партызанскага атрада і пачала збіраць агентурныя звесткі пра дзейнасць вермахта.

Сярод студэнтаў-падпольшчыкаў адзначым студэнтку 2-га курсу геафаку Н. Абрамовіч, якая стварыла падпольную групу са сваіх аднакурснікаў. Яе ўдзельнікі ўладкоўваліся працаваць да немцаў і перадавалі інфармацыю партызанам і падпольшчыкам. Неўзабаве ўдзельнікі групы былі арыштаваныя. Сама Н. Абрамовіч памерла ў канцэнтрацыйным лагеры Асвенцым.

Сярод тых, хто далучыўся да партызанскіх атрадаў, цікавы прыклад Івана Васільевіча Гутарава. У пасляваенны перыяд, ужо стаўшы прафесарам БДУ, ён пісаў, як за ўвесь час, працуючы сярод насельніцтва акупаваных тэрыторый, ён сабраў мноства партызанскіх песень, прымавак, прыказак, сказаў. Усё гэта ў далейшым стала матэрыялам для яго артыкулаў пра партызанскі фальклор.

У першыя дні вайны ў Беразіно студэнты гістарычнага факультэта Ф. Глінскі і В. Віткоўская, муж і жонка, стварылі падпольную групу, якая распаўсюджвала рукапісныя ўлёткі. У канцы 1941 г. пры актыўным удзеле Ф. Глінскага быў створаны партызанскі атрад. У красавіку 1942 г. па даносе партызан ён быў схоплены і павешаны. В. Віткоўскую арыштавала і расстраляла гестапа ў 1944 г. - літаральна за некалькі дзён да прыходу Чырвонай Арміі. Студэнт гістфака А. Вашкевіч стаў падрыўніком. За свае баявыя заслугі ён атрымаў некалькі ўзнагарод. Ужо пасля вайны А.



*12 студэнтаў і настаўнікаў БДУ сталі Героямі Савецкага Саюза: Осіпава Марыя Барысаўна, Гарошак Павел Антонавіч, Жмуркоўскі Дзмітрый Пятровіч, Жолудзеў Наум Ільіч, Зайцаў Мікалай Якаўлевіч, Катлавец Міхаіл Паўлавіч, Кірсанаў Аляксандр Васільевіч, Парахневіч Уладзімір Аляксеевіч, Патрын Аляксей Фёдаравіч, Філімонаў Аляксандр Андрэевіч, Смушкевіч Якаў Уладзіміравіч, Жукаў Георгій Канстанцінавіч.*

П. Вашкевіч скончыў універсітэт, абараніў дысертацыю, займаўся выкладчыцкай дзейнасцю.

Студэнты БДУ змагаліся з фашызмам і за межамі СССР. Такі лёс напаткаў Надзею Лісавец: у студзені 1944 г. яна была арыштаваная і адпраўленая ў канцлагер. Здолеўшы ўцячы з лагера разам з іншымі вязнямі, яна ўзначаліла створаны імі жаночы партызанскі атрад «Радзіма», які дзейнічаў на тэрыторыі Францыі.

Мужнасць і гераічнасць дэманстравалі выкладчыкі і студэнты БДУ і на фронце. Частка студэнтаў гістарычнага факультэта, якія напачатку вайны праходзілі археалагічную практыку ў Крыме, былі вымушаны ўступіць у Чырвоную Армію далёка ад Радзімы.

Выпускнік гістарычнага факультэта П. З. Савачкін ваяваў на фронце афіцэрам у штабе дывізіі. Ён удзельнічаў у баях пад Сталінградам, у фарсіраванні Дняпра, дайшоў да Берліна. Студэнт гістфака А. І. Сідарэнка ў баях пад Ленінградам атрымаў цяжкае раненне. Абодва гісторыкі былі ўзнагароджаны ордэнамі Айчыннай вайны і Чырвонай Зоркі, а пасля вайны працавалі ў БДУ дацэнтамі. Трэба адзначыць, што ў розныя гады яны займалі пасаду дэкана гістарычнага факультэта.

Але, на жаль, не ўсім пашчасціла застацца жывымі. Намаганнямі студэнцкіх атрадаў і на сродкі, заробленыя студэнтамі, на тэрыторыі ўніверсітэта ў 1970-х гг. быў пастаўлены мемарыяльны знак у гонар тых, хто не вярнуўся з Вялікай Айчыннай вайны. Значок-ромбік, “рассечаны” пасярэдзіне контурамі вінтоўкі, знаходзіцца ў цэнтры ўніверсітэцкага дворыка насупраць галоўнага корпуса БДУ. Ён прысвечаны ўсім тым студэнтам універсітэта, якія не паспелі атрымаць сімвалічны знак выпускніка. На помніку можна прачытаць наступныя словы: “Светлай памяці тых, хто з роднага ўніверсітэта пайшоў на святую бітву з фашызмам і смерцю герояў палёг ў бітве, каб вечна свяціла над нашай Радзімай сонца волі”.

***Георгій Булатаў***

# Машына часу, ці хто з моладзі ведае, што было ў вайну

*Не забываецца той урон,*
*не зарастаюць прагалы...*
*«Дзеці, вы вывучылі урок?*
*Дзеці, вы праспрагалі?”*
*А. Вярцінскі, з верша*
*“Рэквіем па кожным чацвёртым”*
*(З часткі “Эпілог.*
*Урок спражэння”)*

Кожны год багаты на розныя святы і юбілеі. У 2015 годзе сусвет будзе сустракаць 70-ю гадавіну Перамогі! Канешне, кожнае свята не магчыма без памяці, а яна ў нас створана з чорных старонак гэтай вайны – месцаў, дзе трымалі і расстрэльвалі насельніцтва.

Наша краіна падчас Вялікай Айчыннай вайны перанесла вялікія цяжкасці і нягоды. Пра яе гісторыю напісана шмат кніг, артыкулаў, мемуараў, але ж, вядома, дакладна ўсё ведаць немагчыма. Але кожная крыніца, якая датычыцца гэтай праблемы, прыўздымае заслону над ходам і асаблівасцямі вайны.

Кожны горад і вёска аддалі сваіх сыноў і дачок на справу абароны вялікай краіны. Амаль у кожнай сям’і было адчуванне горычы, страты сваяка, сябра ці знаёмага. І, безумоўна, пра гэта павінна памятаць і сённяшняе пакаленне.

Ці засталася памяць пра падзеі вайны?

Вуліцы Мінска памятаюць не ўсё, але Мінская зямля да сённяшняга часу, і, вядома, далей будзе адчуваць боль людзей, загінуўшых у канцлагерах і гета. Буйнейшы канцлагер на тэрыторыі Беларусі – Трасцянец. Ён і па сённяшні дзень авеяны сумнымі легендамі. Ён умоўна быў падзелены на тры часткі: Благаўшчына (урочышча на 11-ым км Магілёўскай шашы, якое было месцам масавага знішчэння мірных жыхароў, у т.л. габрэяў); непасрэдна лагер (10-ы км Магілёўскай шашы), які па сваяму прызначэнню лічыўся працоўным; урочышча Шашкоўка ( у 0,5 км ад в. Малы Трасцянец). Зараз да гэтых месцаў можна лёгка дабрацца на грамадскім транспарце, напрыклад, на аўтобусе.



Першым месцам, якое было падрыхтавана да “прыняцця” людзей, стала Благаўшчына – у восені 1941 г., за ёй – Трасцянец-лагер – пачатак 1942 і Шашкоўка – ў восені 1943.

Колькасць загінуўшых на тэрыторыі гэтых месцаў была падлічана… З’явілася такая лічба, як 546 тыс. чалавек. Але пасля перагляду яна стала іншай – больш чым у 2,5 разы паменшылася – 206,5 тыс., апошняя лічба і замацавалася ў афіцыйных дакументах.

Другое места нацыянальнага смутку – Мінскае гета, якое падзяляюць на тры: “Вялікае” (з жніўня 1941 па кастрычнік 1943), “Малое” (з кастрычніка 1943 па чэрвень 1944), “Зондэргета” ( з лістапада 1941 па верасень1943). Колькасць загінуўшых і на дадзены момант не ўдакладнена. У масавых крыніцах толькі ўзгадваецца, што ў ім было больш за 100 тыс. чалавек.

Сёння на гэтых месцах можна пабачыць шматлікія помнікі. Але на гэтым жывым смутку зіхацяць у промнях веснавога святла таксама і жылыя будынкі, скверы, крамы.

Ці ведае мінская моладзь, дзе яна жыве? Аўтар артыкула паспрабавала высвятліць гэта.

Пагутарыўшы з хлопцамі і дзяўчынамі, сярод якіх былі ў большай ступені студэнты (менавіта на іх аўтар і арыентавалася), на жаль, акрэслілася наступнае: амаль палова з тых, хто адказваў на пытанні, не ведае пра месцы масавага знявлоляння падчас вайны. Канешне, гэта залежыць і ад таго, з’яўляюцца ці не яны жахарамі горада і ў якім раёнё жывуць. Але мае сэнс адзначыць, што большасць з тых, хто жыве паблізу былых гета і канцлагера,

дакладна ведае іх месца размяшчэння. Але з агульнай гісторыяй вайны ў роднай краіне ў моладзі ёсць значныя прабелы. Ёсць тыя, хто нічога не ведае пра існаванне канцлагераў на тэрыторыіі дзяржавы, пра канцлагеры недалёка ад Мінска (Дразды, Азарычы), што Хатынь – гэта не лагер… Але некаторыя ведаюць пра сучасныя мерапрыемствы, якія праводзяцца па прапанове ўрада краіны, пра сучасныя носьбіты памяці (напрыклад, парк, прысвечаны падзеям у Трасцянцы) і спяшаюцца паведаміць пра іх, а таксама распавядаюць цікавыя факты 1941 – 1944 гадоў (і не толькі) пра гэтыя мясціны.

"Подзвігу народа жыць у стагоддзях…" Будзем спадзявацца і верыць у тое, што наша пакаленне будзе здольна перадаць сваім нашчадкам не толькі гісторыю вайны, але і пачуццё павагі да герояў таго часу.

***Валерыя Ляшук***

# НАША ПАМЯЦЬ

У рамках нашага гістарычнага факультэта БДУ запушчаны праект, прысвечаны 70-годдзю Вялікай Перамогі на тэму: «Вялікая Айчынная вайна ў лёсах студэнтаў і выкладчыкаў нашага факультэта». Нашы чытачы даслалі ў рэдакцыю Нікі ўспаміны сваіх продкаў, якія мы з вялікай павагай публікуем у дадзеным артыкуле.

*«Нет! Никогда не умирает тот, Чья жизнь прошла светло и беспорочно, Чья память незабвенная живет, В сердцах людей укоренившись прочно».*

*Лопе де Вега*




**Гісторыя дзядулі нашай студэнткі. Шумілінскі раён.**

Аднойчы мой дзядуля выкраў у немца пісталет і схаваў яго ў запечча. Але немец здагадаўся, хто гэта зрабіў, пачаў патрабаваць, каб вярнулі і ўдарыў дзядулю. Дзядуля ўзгадвае шмат жахлівых гісторый з вайны і я спадзяюся, што яны ніколі не паўторацца.

**Пятровіч Ігар**

Сярод маіх сваякоў непасрэдны ўдзел у Вялікай Айчыннай вайне прымала шасцёра чалавек, трое з іх загінула. У прыватнасці, гэта мой родны прадзед па матчынай лініі Дзятко Дзмітрый Якаўлевіч, які праваяваў роўна год з моманту нападу гітлераўскай Германіі на нашу краіну. Ён загінуў у Харкаўскай вобласці 22 чэрвеня 1942.

Тут, у Беларусі, у адной з вёсак Лепельскага раёна, засталіся яго жонка і дачка - мая бабуля. Ім выпала нялёгкая доля без карміцеля аберагаць родны дом, весці гаспадарку, жыць у складаных умовах акупацыі. Паводле словаў маёй бабулі, вельмі часта нямецкія салдаты прыходзілі да іх у якасці няпрошаных гасцей, паводзілі сябе бесцырымонна і жорстка - як самыя

сапраўдныя акупанты. Адбіралі яны, як правіла, прадукты харчавання - малако, курыныя яйкі, мяса.

А адыходзячы ў 1944-м годзе, нямецка-фашысцкія захопнікі часта спальвалі некаторыя сялянскія хаты і вёскі. Пад рызыкай быць спаленым быў і той дом, дзе жылі мае прабабуля з бабуляй, якой на момант заканчэння вайны было ўсяго толькі сем гадоў. Немцы падпалілі адзін дом у іх вёсцы, думаючы, што з дапамогай ветру полымя «перакінецца» на суседнія хаты. Аднак адбыўся цуд - і кірунак ветра раптам змянілася! Вёска, такім чынам, была выратавана ...

Вялікая Айчынная вайна пакінула таксама свой след у лёсе маіх сваякоў па бацькоўскай лініі. У акупаваным нацыстамі Полацку жыла мая прабабуля Пятровіч Вольга Міхайлаўна са сваім сынам (маім будучым дзедам) Альфрэдам. Бліжэй да заканчэння вайны яны былі вывезены па загадзе германскага камандавання на гвалтоўныя працы ў Прусію.

Да вызвалення мае сваякі знаходзіліся фактычна ў няволі. Мой дзед, які тады быў падлеткам, нават у няволі падкрэсліваў сваю прыналежнасць да савецкага народа. Ён нават расказваў, што шэраговыя вайскоўцы гітлераўскай арміі часам маглі на сваіх губных гармоніках граць нашу «Кацюшу». Яны не хацелі вайны, як і большасць народаў свету ...

**<u>Карэтка Дар'я</u>**
Гэта гісторыя маяго прадзеда - Тараса Мікалая Кірылавіча.

Ён служыў на фронце ваенным лекарам у палявым шпіталі. Шпіталь часта пераязджаў з месца на месца. Самым небяспечным для яго былі бамбёжкі, так як усё гэта абсталяванне хутка не згорнеш, а якія самалёты ляцяць, можна было зразумець толькі ўжо на занадта блізкай адлегласці.

Аднак у той частцы, дзе служыў мой прадзед, была незвычайная аўчарка. Яна чула набліжэнне самалётаў задоўга да людзей, і магла на слых вызначыць нямецкія гэта машыны або савецкія. Калі ляцеў варожы дэсант сабака пачынала рыць яму і хавацца ў яе. Вядома, першыя разы на гэта не звярталі ўвагі, але пазней, усё прааналізаваўшы - зразумелі і сачылі за аўчаркай вельмі ўважліва. Яе здольнасць адрозніваць па гуку тэхніку савецкую ад нямецкай выратавала шмат людзей ад смерці.

**<u>Моняк Віталь</u>**

Успаміны пра вайну маёй прабабулі.

Вайна пачалася для нас нечакана- з бамбёжак, з перастрэлак. Ужо 28 чэрвеня да нас прыйшлі немцы. Спачатку многія, у тым ліку і я, спадзяваліся, што немцы будуць да нас ставіцца дастаткова спакойна, лаяльна, бо па расказах маяго бацькі, які жыў пры немцах у гады Першай сусветнай вайны, яны не выяўлялі тады да насельніцтва варожасці. Але гэта быў ужо іншы час. Спачатку яны арыштавалі нашых суседзяў-Каліноўскіх, бо кіраўнік іх сям'і быў актыўным камуністам і кіраваў калгасам. Потым стала вядома, што іх расстралялі, прама ў лесе. Затым яны да нас прычапіліся. Немцы патрабавалі пастаянных паставак харчавання, часам самі бралі, але мы аддавалі перавагу на іх не наракаць, каб не раззлаваць. Пастаўлялі ўсё, што трэба, а яны нас не чапалі. Так усё працягвалася да мая 1943 года.

Тады да нас у горад прыбыў цягнік і прыйшоў загад: дзеяздольных людзей, пажадана дзяўчат, сагнаць у цягнік і адправіць у Германію. Мне было ўжо тады 21 год. Да мяне прыйшоў мясцовы паліцай і загадаў збірацца для адпраўкі ў Германію. Я практычна нічога не здолела ўзяць з сабою, бо часу было адведзена мала. Мяне прывялі на вакзал. Там было шмат іншых людзей, у поглядзе якіх чытаўся адчай, боль, жах і разуменне, што, магчыма, яны больш ніколі не вернуцца. І раптам у адной жанчыны здарылася істэрыка, бо яе дачку таксама забіралі ў Германію. А ёй было ўсяго толькі 19. У выніку гэтую жанчыну забілі, а дачку сілком адправілі ў цягнік. Усе мы паехалі ў невядомасць. Але ў Германію я не трапіла, бо на наступным жа прыпынку, карыстаючыся блытанінай, я бегла. Сама не ведаю, як мяне немцы не заўважылі, але тады у мяне былі дзіўныя пачуцці: гэта і радасць з нагоды ўласнага выратавання, і жах ад магчымага лёсу тых людзей, якія, верагодна, ніколі не вернуцца дадому. Я да хаты вяртацца не магла, таму пайшла куды вочы глядзяць. У выніку апынулася каля Беластока, дзе раней жылі мае бацькі. Там я ўладкавалася працаваць паштальёнам, так і працавала на гэтай пасадзе да самага заканчэння вайны. Але пасля вызвалення я вырашыла не вяртацца назад, бо нікога з родных там ужо не было, а засталася тут. Вось так прайшла для мяне вайна.

**<u>Крыцук Раман</u>**
Мой дзед Пётр Іванкоў быў снайперам у кампаніі супраць Японіі - на тэрыторыі Маньчжурыі - ў 45-м годзе там пачаўся наступ (сам ён памёр даўно ўжо).

Дык вось, калі яны ўступілі ў Кітай ,то там была страшэнная галеча: адыходзячая Квантунская армія настолькі абдзірала кітайцаў, што ім амаль не было ў чым хадзіць - усе студні былі атручаны. А яшчэ ён ўзгадваў момант, калі іх калонну пачалі бамбіць свае ж самалёты - і адзін з байцоў схапіў ці то сцяг, ці то будзёнаўку і пачаў махаць ёю - яго заўважылі і спынілі налёт.

*Вось яна, вайна. Вось наш падручнік па гісторыі! Дзякуй усім за дапамогу! Чакаем ад вас новых гісторый!*

***Іван Прыстаўка***

# Крыжаванка



## Па вертыкалі:

1. Назавіце прозвішча генеральнага камісара Беларусі, які быў прызначаны пасля забойства В. Кубэ.
3. Якую назву мела атамная бомба, што была скінута на японскі горад Хірасіму?
5. Назавіце прозвішча першага кіраўніка Цэнтральнага штаба партызанскага руху.
7. Назавіце месца, дзе быў 9 мая падпісаны Акт капітуляцыі Германіі.
9. Назавіце прозвішча савецкага партызана, камандзіра партызанскага атрада і брыгады, які з дапамогай “вугальных мін” падарваў 93 нямецкіх паравоза.
11. Назавіце прозвішча аднаго з герояў абароны Брэсцкай крэпасці, які трапіў у палон толькі 23 ліпеня 1941 года.
13. Назавіце польскі горад, у якім пачалася першая страляніна Другой сусветнай вайны.
16. Назавіце прозвішча генерала Чырвонай арміі, які ўзначальваў 3-і Беларускі фронт у час правядзення аперацыі “Баграціён”.
17. Назавіце абарончае збудаванне на захадзе Беларусі, якое адным з першых прыняло ўдар нямецкай арміі і дзе апошняй першы раз за Вялікую Айчынную вайну прыйшлося адступіць.
19. Назавіце беларускі горад, дзе ў 1943 годзе была праведзена самая буйная сухапутная транспартная дыверсія часоў Другой сусветнай вайны.
21. Назавіце аперацыю Чырвонай арміі, падчас якой была цалкам вызвалена тэрыторыя Беларусі.
23. Назавіце сакрэтны план нямецкага ўраду па правядзенні этнічных чыстак на тэрыторыі Усходняй Еўропы і яе нямецкай каланізацыі пасля перамогі над СССР.
25. Назавіце прозвішча генерала Чырвонай арміі, які ўзначальваў 2-і Беларускі фронт у час правядзення аперацыі “Баграціён”.
25. Назавіце бітву, якая па сваім маштабе, выкарыстаным сілам і сродкам, напружанасці, вынікам і ваенна-палітычным наступствам была адной з ключавых бітваў у Другой сусветнай, а таксама самым буйным танкавым супрацьстаяннем у гісторыі.
27. Назавіце план вайны Германіі супраць Францыі і краін Бенілюкса ў 1940 годзе.
29. Назавіце прозвішча чалавека, што ўдзельнічаў у стварэнні аднаго з першых партызанскіх фарміраванняў на тэрыторыі Беларусі, Героя Савецкага Саюза (1941).
31. Назавіце прозвішча нямецкага грос-адмірала, які пасля смерці Гітлера стаў Рэйхспрэзідэнтам Германіі.
33. Назавіце амерыканскі карабель, на борце якога быў падпісаны Акт аб капітуляцыі Японіі.
35. Назавіце нямецкі Рэйхскамісарыят, у які ўваходзіла большая палова тэрыторыі Беларусі падчас вайны.

37. Назавіце прозвішча генерал-маёра, украінскага партызана, які здзейсніў у 1943 годзе Карпатскі рэйд.
39. Назавіце прозвішча кіраўніка Беларускага штаба партызанскага руху.
43. Назавіце вайсковыя фарміраванні польскага падполля ў часы Другой сусветнай вайны.
45. Назавіце другі этап буйнейшай аперацыі беларускіх партызан па разбурэнню чыгуначных шляхоў у тыле ворага.
47. Назавіце прозвішча савецкага ваеннага лётчыка, які здзейсніў агністы таран ў механізаваную калону ворага 26 чэрвеня 1941 года.

## Па гарызанталі:

2. Які беларускі абласны цэнтр быў вызвалены першым?
4. Якую назву мела першая карная аперацыя нямецкіх войскаў па масавым знішчэнні яўрэйскага насельніцтва на тэрыторыі Беларусі?
6. Назавіце прозвішча нямецкага генерал-фельдмаршала, які падпісаў Акт капітуляцыі Германіі.
8. Назавіце прозвішча Маршала Савецкага Саюза, які ўзначальваў 1-ы Прыбалтыйскі фронт у час правядзення аперацыі "Баграціён".
10. Назавіце горад у сучаснай Расіі, за які са студзеня 1942 года па сакавік 1943 года ішлі зацятыя баі, дзе Чырвонай арміяй былі праведзены 4 наступальныя аперацыі.
12. Назва плана вайны Германіі супраць СССР, здзейснены ёю у 1941 годзе.
14. Назавіце бітву на Волзе, якая стала адной з пераломных у Вялікай Айчыннай і Другой сусветнай вайне.
16. Як называецца праследаванне і масавае знішчэнне нацыстамі прадстаўнікоў розных этнічных і сацыяльных груп, у першую чаргу яўрэяў?
18. Назавіце прозвішча аднаго з арганізатараў і кіраўнікоў партызанскага руху на Беларусі, які арганізаваў і ўзначаліў адзін з першых на Беларусі партызанскіх атрадаў.
20. Назавіце раённы цэнтр, які быў першым вызвалены на тэрыторыі Беларусі.
22. Назавіце прозвішча выключнага дзеяча партызанскага руху Беларусі, які пасля вайны ўзначальваў перадавы калгас "Рассвет".
24. Назавіце месца правядзення другой па ліку сустрэчы лідэраў краін антыгітлераўскай кааліцыі – СССР, ЗША і Вялікабрытаніі – падчас Другой сусветнай вайны. Сустрэча прысвечана усталяванню пасляваеннага сусветнага парадку.
26. Назавіце прозвішча аднаго з кіраўнікоў абароны Брэсцкай крэпасці, палкавога камісара, што загінуў у чэрвені 1941 года.
28. Назавіце прозвішча нямецкага генерал-фельдмаршала, які камандаваў групай арміі "Цэнтр" у час уварвання ў СССР.
30. Назавіце прозвішча Маршала Савецкага Саюза, аднаго з аўтараў і выканаўцаў плана "Баграціён" і камандуючага 1-м Беларускім фронтам падчас яго здзяйснення.
32. Назавіце прозвішча 1-га Прэзідэнта Беларускай Цэнтральнай Рады.
34. Назавіце прозвішча генерала Чырвонай арміі, які ўзначальваў Заходні фронт у пачатку Вялікай Айчыннай вайны і які быў расстраляны ў ліпені 1941 года.
36. Назавіце савецкі горад, які трымаў аблогу ад нямецкіх, фінскіх і іспанскіх (Блакітная дывізія) войскаў на працягу 872 дзён.
38. Назавіце план вайны Германіі супраць Польшчы ў 1939 годзе.
40. Назавіце горад, які ў 1944 годзе быў аддадзены Польшчы са складу БССР.
42. Назавіце прозвішча нямецкага генерал-палкоўніка, ваеннага тэарэтыка, родапачынальніка танкабудаўніцтва ў Германіі і танкавага роду войскаў у свеце, які прымаў парад у Брэсце 22 верасня 1939 года.
44. Назавіце дзяржаўную праграму, па якой ЗША перадавалі сваім саюзнікам у Другой сусветнай вайне боепрыпасы, тэхніку, прадукты харчавання і стратэгічную сыравіну, уключаючы нафтапрадукты.
46. Назавіце прозвішча генерал-лейтэнанта Чырвонай арміі, які быў пакараны смерцю нацыстамі ў лагеры Маўтхаўзэн.
48. Назавіце ўмоўную назву адной з буйнейшых аперацый беларускіх партызан па разбурэнню чыгуначных шляхоў у тыле ворага ў 1943 годзе.
49. Назавіце французскі знішчальны авіяполк, які ў 1944 г. удзельнічаў у аперацыі "Баграціён".
50. Назавіце прозвішча савецкай разведчыцы, непасрэднага выканаўцы плана па знішчэнню генеральнага камісара Беларусі Вільгельма Кубэ.

# Служба без адрыву ад навучання

Ці ведаеце вы, што па сканчэнні гістфаку можна атрымаць адразу дзве спецыяльнасці: грамадзянскую і вайсковую. Калі з грамадзянскай ўсё зразумела: мы вучымся, "жывем у нацыянальцы", здаем залікі і іспыты, курсавыя і дыплом.Пасля, атрымоўваем дакумент, які паведамляе нашым будучым прадаўцам аб тым, што мы прафесійныя гісторыкі. Пра вайсковую адукацыю, я лічу, трэба паразмаўляць асобна. Ці кожны можа атрымаць такую спецыяльнасць? Тут дрэнная інфармацыя для дзяўчат – ваенная спецыяльнасць толькі для хлопцаў. І справа не ў прыніжэнні жанчын і іншых прычынах, пра якія так любяць казаць феміністкі. Па-першае, гісторыкі разам з фізікамі вучацца на артылерыстаў. А гэта фізічна цяжка - праца са зброяй.

Па-другое, самым важным аспектам як у звычайным жыцці, так і ў вайсковым з'яўляецца здароўе. Таму абавязковае патрабаванне для паступлення - медыцынская даведка са станоўчай адзнакай.

Курсанты слухаюць лекцыі, вучацца вырашаць задачы, спрабуюць свае сілы на палігоне. Тут трэба мець не толькі разумовыя здольнасці, але і добрую фізічную падрыхтоўку.

Колькі часу адбываецца навучанне? Ці трэба хадзіць на заняткі ўсе 5 год? Навучанне адбываецца на працягу 1-1,5 гадоў. Пасля заканчэння першага курса ваеннай кафедры курсанты здаюць іспыт, па выніках якога частка з іх пераходзіць на наступны этап навучання. Тыя, хто не пройдуць далей, службу ў войску не абмінуць, але значна яе скароцяць. Летам курсантаў чакае месяц службы ў палявых умовах. Менавіта тут можна зразумець усе цяжкасці ваеншчыны

— Як ваенная кафедра паўплывала на нашых студэнтаў?

— Яўген Сітко, выпускнік 2014г.: "Военная кафедра дала мне знания в области тактической подготовки, управления подразделением. Это помогает мне и в игре в лазертаг, и в построении моего бизнеса. Также познакомила с военной службой и показала мне спартанские условия проживания. Теперь есть мерило для всего остального. А также мне стало ясно кто есть кто - это про ребят, с которыми я учился вместе и был на сборах."

***Кацярына Дзегцярова***

## ПОВОРОТ НА ХАТЫНЬ

Полоцк – Минск… Километры дороги
Остаются один за другим
Позади… А столицы пороги
Приближает тот лес, что храним

Исторической памятью, правдой…
Перекрёсток вдали за окном
Показался – и, словно засадой,
Затаился поблизости дом.

Рядом с ним непростой указатель –
Поворот на деревню Хатынь,
Что в военную пору каратель
Уничтожил, как пламя полынь;

Там не слышно ни детского смеха,
Ни крестьянских частушек лихих –
Только скорбное, горькое эхо,
Шум печальный берёз молодых.

И хатынская медь призывает
На минуту задуматься нас
О сожжённых – они не узнают,
Как живут их потомки сейчас…

…А автобус стремительно мчится
К центру нашей державы родной…
Что ж, привет, дорогая столица,
Выдающийся город-герой!

***Ігар Пятровіч***



# КЛІА

Добры дзень, шаноўнае спадарства.
Спадарыня Кліа падрыхтавала цікавыя і смешныя выказванні нашых выкладчыкаў пра ВАВ, таму адцягніцеся і пасмейцеся разам з ёю.



**Корзун М.С.**

Адказ Корзуна М. С. на пытанне аб дзейнасці Рускай праваслаўнай царквы ў час Вялікай Айчыннай вайны:
— Оооо! А ведаеце, што мангола-татары, калі прыйшлі на Русь, правялі перапіс насельніцтва?! А хто яшчэ так рабіў ??? Гэта вам не грэчаскія ілоты, якія зусім ... Хаця Сталін сказаў ... і хто не ведае, што ў Новым Запавеце сказана: «Хто не укладзе меч у похвы свае, ад яго і загіне!» А манголы не дурні — яны ведалі ... Яшчэ Мефістофель сказаў!!! У мяне, як у акупацыйнага хлопчыка, быў рэмень нямецкі, на ім быў надпіс:«Бог з намі!» А свастыку я ціхенька напільнікам спілаваў – разумееў!!! Дык які Ціхан??? Прыходаў праваслаўных не зменшылася!!!! Зразумела?!!

***

**Захаркевіч С.А.**

На семінары па гісторыі Беларусі: (выкладчык - студэнту): - А распавядзіце нам, калі ласка, яшчэ што-небудзь з уласных успамінаў пра Вялікую Айчынную вайну.

***

**Шумскі І.І.**

Немцы, як заўсёды, ваявалі да пераможнай паразы!

***

**Боўсун Г.А.**

Абяцаю, што вы будзеце ведаць не толькі гісторыю вайны, але і кожнага байца пайменна.
Італія перад вайной грала ролю нявесты, якая назірала і абірала з кім узяць шлюб.
У нас тут сусветная вайна пачынаецца, а вы пра бутэрброды думаеце!
Версальска-Вашынгтонская сістэма была заснаваная на тым, што Германію пакрыўдзілі ...
Давайце мы з вамі сустрэнемся, падумаем пра вечнае і, адразу да савецка-германскіх адносінаў.

Спадзяюся, Вам спадабалася.
Вы можаце дапамагчы мне, дасылаючы свае назіранні за выкладчыкамі і студэнтамі на маю электронную скрыню: 6683720@mail.ru
Дзякуй за ўвагу!

NIKA

Студэнцкая газета гістарычнага факультэта БДУ

**Адрас рэдакцыі:**
г. Мінск, вул. Чырвонаармейская, 6.
**Тэл.** +375447667057
**E-mail:** his.shur@gmail.ru.
**Web:** http://hist.bsu.by/studentam/pressa.html
**Група ў «Вконтакте»:** http://vk.com/public_nika

**Галоўны рэдактар:**
Уладзіслаў ШУР

**Нам.галоўнага рэдактара:**
Вераніка КАСКО

**Заснавальнік:** Студэнцкая Рада па якасці адукацыі гістарычнага факультэта БДУ

**Дызайн і вёрстка:**
Ілля БАНЦЭВІЧ

Распаўсюджваецца на правах унутраннага карыстання
**(бескаштоўна)**

Меркаванні аўтараў могуць не супадаць з пазіцыяй рэдактараў.